# ИСТОРИКО–КУЛЬТУРОЛОГИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ТУРИЗМА И ГОСТЕПРИИМСТВА

УДК 338.48

## ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСКАГА АБ`ЯДНАННЯ ЭКСКУРСАВОДАЎ І ГІДАЎ–ПЕРАКЛАДЧЫКАЎ

***М.А. ЧЫРСКІ***
*Беларускае грамадскае аб`яднанне экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў,*
*г. Мінск, Рэспубліка Белаурсь*

27 версня 1996 года ў Сусветны Дзень турызму у Мінску адбылася Устаноўчая канферэнцыя па стварэнні грамадскага аб`яднання экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў. Напярэдадні была створана ініцыятыўная група, у якую увайшлі Федарцова Т.А., Сісмеева Я.А., Хвагіна Т.А. і Чыркскі М.А. Быў падрыхтаваны праект Статута грамадскага аб`яднання і да правядзення Устаноўчай канферэнцыі быў надрукаваны у газеце «Туризм и отдых». На беларускім радыё у перадачы «Актуальны мікрафон» Федарцова Т.А. і Чырскі М.А. расказалі аб тых умовах, у якіх апынуўся экскурсійна–пазнавальны турызм у краіне, звярнуліся з прапановай да экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў Беларусі аб`яднацца у прафесійную арганізацыю і запрасілі іх на устаноўчую канферэнцыю. На канферэнцыю, якая адбылася на геаграфічным факультэце БДУ, прыехалі экскурсаводы і гіды–перакладчыкі з усіх рэгіёнаў Беларусі. Ўдзельнікі гаварылі аб важнасці стварэння грамадскага аб`яднання экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў. Было вырашана назваць арганізацыю Грамадскае аб`яднанне «Беларуская асацыяцыя экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў» (скарочана ГА «БАЭіГП») і стварыць рэгіянальныя аддзяленні.

Выбраны кіруючыя органы грамадскага аб`яднання – Праўленне і Рэвізійная камісія. Прэзідэнтам выбралі кандыдата геаграфічных навук, дацэнта БДУ Федарцову Т.А., яе намеснікамі віцэ прэзідэнтам Чырскага М.А., Касцюковіч Л.В., Стальную І.Г. Старшынёй Рэвізійнай камісіі быў абраны Мельніцкі Л.А. Пасля завяршэння канферэнцыі адбылася экскурсія «Купалавым гасцінцам» па маршруту Мінск–Даўгінаўскі гасцінец–Карпілаўка–Акопы–Харужанцы, якую правёў Мікола Чырскі.

2 снежня 1996 года Міністэрства юстыцыі зарэгістравала аб`яднанне. Перарэгістрыравана арганізацыя Міністэрствам юстыцыі 16 верасня 1999 г., і 26 студзеня 2012 г. – пасля чаго арганізацыя стала называцца Беларускае грамадскае абяднанне экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў (скарочана БГАЭіГП).

На працягу 1997 года былі створаны аддзяленні грамадскага аб`яднання у найбольш «экскурсійных» гарадах Беларусі. Іх узначалілі вядомыя, вопытныя і аўтарытэтныя экскурсаводы краіны: У Мінску – Тарасава Л.В, ў Брэсце – Сісмеева Я.А., ў Пінску – Хвагіна Т.А., ў Віцебску – Рудая Л.Ф., ў Полацку – Каліноўскі І.І., ў Гродна – Русецкая Л.Я., ў Магілёве – Супіталёва Л.І., ў Гомелі – Мілашэўская Р.І. [1].

У час станаўлення грамадскага аб`яднання была праведзена інветарызацыя экскурсійных маршрутаў па Беларусі. У Мінску, Брэсце, Пінску, Віцебску, Гродна, і Гомелі былі выдадзены экскурсійныя даведнікі з анатацыямі, што садзейнічала папулярнасці новых экскурсійных маршрутаў.

У 1997 годзе Брэсцкае аддзяленне БАЭіГП стварыла метадычны кабінет і пачало падрыхтоўку маладых экскурсаводаў. У метадычным кабінеце на грамадскіх пачатках былыя метадысты Брэсцкага бюро падарожжаў і экскурсій праводзілі метадычныя заняткі для дзеючых экскурсаводаў і гідаў–перакдадчыкаў. Была падрыхтавана праграма падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі эскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў. Праведзены 3–хмесячныя курсы павышэння кваліфікацыі без аплаты для працуючых экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў і 6–цімесячныя курсы па падрыхтоўцы будучых экскурсаводаў. Выпуск экскурсаводаў адбыўся у маі 1998 года. Нажаль, з выхадам Указа Прэзідэнта аб грамадскіх арганізацыях, аб тым, што членамі грамадскага аб`яднання могуць быць толькі фізічныя асобы, гэты метадычны кабінет у 1999 годзе прышлося закрыць з–за адсутнасці сродкаў яго ўтрымання.

У 1997 – 1998 і 2000 – 2001 гадах на грамадскіх пачатках Пінскае аддзяленне БАЭіГП праводзіць курсы па падрыхтоўцы маладых экскурсаводаў і адначасова па павышэнню кваліфіка-

ПолесГУ

цыі дзеючых экскурсаводаў. Дзякуючы гэтай працы да экскурсійнай справы далучылася каля дваццаці чалавек. Паралельна з правядзеннем курсаў па падрыхтоўцы экскурсаводаў вялася работа па стварэнню цэлага блока новых экскурсій па Пінску і Пінскаму Палессю. Асноўная праца была праведзена Хвагінай Т.А. пры удзеле членаў грамадскага аб`яднання. У выніку была падрыхтавана дакументацыя (тэхналагічныя карты экскурсіі і кантрольныя тэксты) да наступных экскурсій: «Пінск – горад дзевяці стагоддзяў» (2 варыянты, для дарослых і дзяцей), «У вытокаў горада над Пінай», «Па гістарычнаму цэнтру Пінска», «Па галоўнай вуліцы сталіцы Палесся», «И помнит мир спасенный…», «Наш парк», «Дзе Піна з Прыпяццю зліліся», «Архітэктурныя помнікі Пінска» [2].

У 1997 годзе напярэдадні 900 – гадовага юбілея Пінска была праведзена прэзентацыя кіраўніцтву горада і супрацоўнікам гарвыканкама экскурсіі «Пінск – горад дзевяці стагоддзяў», якая атрымала высокую адзнаку. Для ўсіх экскурсаводаў Пінска, якія імкнуліся авалодаць новай агляднай экскурсіяй была створана магчымасць абарона экскурсій на маршруце, праслухоўванне цягнулася больш за тыдзень і дало свае вынікі – да юбілею горада над Пінай было падрыхтавана дванаццаць экскурсаводаў, частка з якіх праводзіла экскурсіі не толькі на рускай, але і на беларускай і польскай мовах. Удзельнікі свята адзначылі высокі узровень прапанаваных экскурсій і новы падыход да падбору аб’ектаў, інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў, удасканаленне маршрута і экскурсійнай методыкі, якая ўзбагацілася панарамнымі паказамі, прыёмамі рэканструкцыі і параўнання.

Да 900–гадовага юбілею Пінска экскурсаводы пінскага гарадскога аб`яднання выступілі з ініцыятывай усталявання памятнага знака на былым дзяцінцы старажытнага горада. У выніку на галоўнай плошчы горада быў усталяваны памятны знак «Адсюль пачынаўся наш горад над Пінай», а ў дадатак удалося пераканаць мясцовыя ўлады, не чапаць захаваны да сённяшнага часу ўчастак землянога вала вакольнага горада, дзе збіраліся паставіць металічныя гаражы.

Штуршок, які даў юбілей горада экскурсійнай справе быў вельмі значны. У 1997–1998 гг. Пінскім гарадскім аддзяленнем БГАЭіГП быў арганізаваны месячнік экскурсій для вучнёўства да юбілею горада. Ідэя была у тым, каб кожны вучань горада пабываў на адной экскурсіі. Многія школы, дзіцячыя сады, ПТВ і тэхнікумы пабывалі амаль на ўсіх гарадскіх экскурсія Пінска. Месячнік расцягнуўся на год нават прадоўжыўся у 1998 і 1999 гг. Ўсяго пабывала на экскуріях 12,5 тыс. школьнікаў, хоця да гэтага экскурсійная справа ў Пінску сышла на нет (што год замаўлялася не больш чым адна–дзве экскурсіі і на тыя не маглі знайсці экскурсаводаў, таму што ў турыстычных фірмах не было адпаведных спецыялістаў, а таксама імкнення займацца такой творчай і складанай справай, якой з’яўляецца распрацоўка, арганізацыя і правядзенне экскурсій).

У 1998 годзе была распрацавана новая экскурсія «Па зямлі, якая надхняла Адама Міцкевіча». Падрыхтавана 6 экскурсаводаў па гэтай тэме. Праведзены дзве прэзентацыі экскусіі для настаўнікаў–філолагаў пінскіх школ і журналістаў, краязнаўцаў, музейных супрацоўнікаў і прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый Пінска. Да 200–годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча быў арганізаваны месячнік экскурсій і праведзена віктарына. У віктарыне прымалі удзел не толькі школьнікі, але і дарослыя, многія прысылалі акрамя адказаў на пытанні віктарыны, якія друкаваліся у газеце «Пинский вестник», і свае рэфераты і вершы. Пераможцы віктарыны атрымалі прызы і бясплатную экскурсію па мясцінах знакамітага ўраджэнца Беларусі. Ад пінскіх экскурсаводаў і ЭМА «Палессе» музею Адама Міцкевіча ў Навагрудку падаравалі тканы рушнік, зроблены у Пінску з вышытымі на польскай мове радкамі «Jest u mnie kraj – Ojczyzna myśli mojej …».

У 1999 годзе шырока святкавалася 200–годдзе з дня нараджэння А.Пушкіна. Сумесна з ЭМА «Палессе» для школьнікаў і моладзі Піншчыны былі арганізаваны аўтобусныя вандроўкі на Пушкінскіх мясцінах і турыстычны цягнік (магчыма першы у незалежнай Беларусі) Пінск – Полацк. У Полацку ўдзельнікі гэтага юбілейнага парадарожжа пераселі ў аўтобусы і адправіліся ў Пушкінскія горы. Гэты турыстычны цягнік у Полацку прымаў пад сваю апеку старшыня Полацкага гарадскога аддзялення Іван Каліноўскі, які таксама праводзіў актыўную работу па распрацоўцы новых і адраджэнні раней распрацаваных экскурсійных маршрутаў, падрыхтоўцы кадраў, стварэнню адпаведнай метадычнай дакументацыі і папулярызацыі роднага горада і ўсёй Полаччыны сярод турыстынай грамадзкасці і насельніцтва Рэспублікі.

У гэты перыяд такая самаадданая і надхнёная праца дала добры плён – у большасці рэгіёнаў яна была падтрымана мясцовымі аддзеламі адукацыі і школамі, таму экскурсаводаў патрабавалася ўсё больш. Папулярнасць экскурсіі ў гэты час спрыяла таму, што гэтай справай зацікавіліся настаўнікі сярэдніх школ і выкладчыкі сярэдне–спецыяльных устаноў. Так, ў 1999 годзе на бясплатныя курсы па падрыхтоўцы экскурсаводаў, якія ў другі раз за постсавецкі час былі арганізаваны ў Пінску на якія запісалася больш 50 чал., з якіх амаль усе былі настаўнікамі школ. 25



Полесгу

чалавек з гэтага набору добра здалі выпускныя экзамены і на гэты момант 12 здалі экскурсіі на маршрутах. Выпускнікі курсаў бралі актыўны удзел да тэхалагічная дакументацыі да экскурсій «У люстэрку стагоддзяў» (Пінск–Гродна), «У прыклад нашчадкам» (Пінск–Брэст), і іншых. У 2000 годзе быў выдадзены анатаваны даведнік экскурсій па Пінску, Палессю і Беларусі для школ Пінска і Пінскага Палесся. Кожны класны кіраўнік на жнівеньскіх настаўніцкіх чытаннях атрымаў экземпляр, што дазволіла развіваць экскурсійны турызм у рэгіёне і забяспечыць працай выпускнікоў курсаў і дзеючых экскурсаводаў.

У мэтах папулярызацыі турысцкіх магчымасцей Беларусі на прыканцы 1990–х гадоў XX ст. прэзідэнтам грамадскага абяднання Чыркім М.А. была ініцыявана ідэя стварэння і выдання даведнікаў і навукова–папулярных выданняў па знакамітых мясцінах Беларусі.У рамках праекта былі падрыхтаваны і выдадзены наступныя выданні: «Чароўная казка Палесся» (Хвагіна Т.А.), «Палессе ад Буга да Убарці» (Хвагіна Т.А.), «Пінск» (Хвагіна Т.А.), «Мінск» (Чыркім М.А.), «Мінск і яго ваколіцы» (Чыркі М.А.), «Гасцінцам Купалы» (Чыркі М.А.), «Полацк» (Каліноўскі І.І.), «Полацк и ваколіцы» (Каліноўскі І.І.) і іншыя [1].

Праўленнем грамадскага аб`яднання у 1999 годзе было прынята рашэнне выдаць экскурсаводам і гідам–перакладчыкам Беларусі бэджы з пералікам тэм экскурсій, якія яны праводзяць. Была распрацавана адзіная форма бэджа, затым яны былі надрукаваны і выдадзены гарадскімі аддзяленнямі практыкуючым экскурсаводам і гідам–перакладчыкам – Мінска, Брэста, Пінска, Гродна, Магілёва.

У канцы 1990–ых – пачтку 2000–ых гадоў сярод экскурсійных цэнтраў Беларусі асабліва актыўнай работай і шматлікіямі ініцыятывамі вылучаўся Пінск, які пэўны час адыгрываў ролю эксперыментальнай пляцоўкі па стварэнню ці адраджэнню разнастайных форм экскурсійная працы. У маі 1999 года ў Пінску адбыўся сапраўдны дзіцячы экскурсійны фэст пад назвай «Памяць стагоддзяў». Гэтаму святу папярэднічала вялікая праца, якая вялася ў некалькіх накірунках: арганізацыя і правядзенне экскурсійнага месячніка для школьнікаў Пінска і рэгіёна; арганізацыя і правядзенне творчых конкурсаў, звязаных з тэмай экскурсій і краязнаўства (фотамастацтва, выяўленчага мастацтва, краязнаўчых даследванняў, вершаў і прозы: конкурса макетаў гістарычных помнікаў; конкурса на лепшы сувенір, які адлюстроўвае адметнасць Палесся; падрыхтоўка школьнікаў да тэатралізаванай віктарыны « Памяць стагоддзя»); папулярызацыя экскурсій. У правядзенні экскурсійнага фэста Пінскае аддзяленне БАЭіГП супрацоўнічала з Аддзелам адукацыі Пінскгага гарвыканкама, народным тэатрам ДК «Трыкатажнік», шматпрофільным прадпрыемствам ЭМА «Палессе», пінскай фабрыкай мастацкіх вырабаў. Усе школы і вучэбныя ўстановы Пінска былі ахоплены экскурсіямі разнастайнай тэматыкі. Часта атрыманых даходаў пайшла на правядзеннне свята і прызы для ўдзельнікаў шматлікіх конкурсаў. Старшыня Пінскага аддзялення БАЭіГП была аўтарам сцэнарыя свята, вядучай, яна праводзіла адборны кастынг школьнікаў,а затым рыхтавала іх да ўдзела ў тэатралізаванай віктарыне, якая прайшла з вялікім поспехам у вялікай зале ДК «Трыкатажнік», дзе сабраліся школьнікі, настаўнікі, бацькі, мясцовыя экскурсаводы і краязнаўцы. Журы ўзначальвала галоўны спецыяліст Брэсцкага абласнога ўпраўлення па спорту, фізічнай культуры і турызму. Рэпартаж са свята трансліравалўся па мясцовым тэлеканале і атрымаў пазітыўны грамадскі водгук. Апрача ганаровых грамат, дыпломаў і каштоўных падарункаў, пераможцы – тры школы Пінска, а таксама шэсць ўдзельнікаў тэатралізаванай віктарыны атрымалі магчымасць прыняць удзел у бесплатных цікавых экскурсіях па Беларусі.

Па ініцыятыве старшыні Пінскага аддзялення грамадскага аб`яднання «Беларуская асацыяцыя экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў» Хвагінай Т.А.

у 1999 годзе у Пінску 27–29 красавіка быў праведзены першы семінар па экскурсійнай справе ў незалежнай Беларусі, а магчыма гэта быў першы такога роду семінар на постсавецкім прасторы. Тэма семінара: «Экскурсійны менеджмент і развіццё турысцка–экскурсійных маршрутаў на сучасным этапе». У рабоце семінара прынялі удзел намеснік міністра спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Шаршавіцкі М.В., кандыдат гістарычных навук, старэйшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, член Саюза пісьменнікаў С.В.Тарасаў, кандыдат геаграфічных навук, дацэнт БДУ, прэзідэнт ГА «БАЭіГП» Федарцова Т.А., кансультант упраўлення турызму міністэрства спорту і турызму, віцэ–прэзідэнт ГА «БАЭіГП» Чыркі М.А., практыкі экскурсійнай справы, метадысты, экскурсаводы, гіды–перакладчыкі, кіраўнікі турысцкіх арганізацый, выкладчыкі ВНУ краіны – усяго 48 чалавек з усіх рэгіёнаў Беларусі.

Выступленне з асноўным дакладам намесніка міністра спорту і турызму Шаршавіцкага М.В. «Аб асноўных падходах па стварэнні новага вобраза Рэспублікі Беларусь» вызначыла стратэгію і ход абмеркавання цэлага комплекса важнейшых праблем экскурсійнай работы. Іх абмеркаванне

было праведзена на трох пленарных пасяджэннях і сустрэчах за «круглым сталом». Абмяркоўваліся наступныя тэмы: «Турысцка–экскурсійны прадукт на сучасным этапе», «Падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кадраў для турысцка–экскурсійнай работы», «Экскурсія неадемная частка вучэбна–выхаваўчага працэса. Арганізацыя экскурсійнай работы з вучнёўскай моладдзю», «З вопыта работы па арганізацыі экскурсійных тураў у краіны Усходняй Еўропы».

На семінары абмяркоўваўся шырокі дыяпазон праблем турысцка–экскурсійнай работы. Да найбольш актуальных праблем турысцска–экскурсійнай работы, якія абмяркоўваліся на семінары адносяцца: распрацоўка нарматыўна–прававой базы; стварэнне інфраструктуры турызма; удасканальванне метадычнай работы; распрацоўка і удасканальванне тэматыкі экскусій і культурна–пазнавальных тураў па Беларусі».

Удзельнікі семінара прынялі рашэнне па аднаўленню і паляпшэнню метадычнага забеспячэння экскурсійнай работы у турысцкіх арганізацыях Беларусі. У мэтах павышэння якасці праводзімых экскурсій прапанавалася стварыць адзіную сістэму адукацыі у экскурсійнай рабоце: падрыхтоўка, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі экскурсійных кадраў. Правесці работу па актуалізацыі дзеючых тэм экскурсій, а таксама стварэнню новых тэм экскурсій для розных катэгорый насельніцтва, асабліва для вучнёўскай моладзі. Тураператарскім арганізацым Беларусі удзельнікі семінара рэкамендавалі планаваць расходы на выкананне экскурсійна–метадычнай работы, па падрыхтоўцы і асваенню новых відаў экскурсійных паслуг, а таксама на рэалізацыю мерапрыемстваў, накіраваных на карэннае паляпшэнне якасці экскурсійнага абслугоўвання.

Практычная частка семінара у Пінску была прадстаўлена экскурсіямі па гораду «Пінск горад дзевяці стагоддзяў» (экскурсавод Чараўко І.Д.) і цеплаходнай экскурсіяй па Прыпяці і Піне. Старшыня Пінскага аддзялення ГА «БАЭіГП» Хвагіна Т.А. правяла экскурсію «Узоры, паданні і песні Палесся» Пінск–Моталь, якая была успрынята удзельнікамі семінара як новы, дасканалы турпрадукт, які патрабуе неадладнай прапаганды, а таксама як выдатны эталон прафесійнага майстэрства распрацоўшчыкаў і экскурсавода. які данёс да аўдыторыі шмат цікавых ведаў аб палескім краі і ягонай этнаграфічнай спадчыне.

Удзельнікі семінара прынялі рашэнне «Аб першачарговых задачах па развіцці экскурсійнай справы у Рэспубліцы Беларусь» (захаваліся відэазапісы тэлевізійнага сюжэта, прысвечанага адкрыццю семінара).

«27–29 красавіка 1999 года у Пінску праведзены семінар па актуальных праблемах развіцця экскурсійнай справы у Беларусі на сучасным этапе. Ініцыятарамі правядзення семінара былі Грамадскае аб`яднанне «Беларуская асацыяцыя экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў» і Пінскае аддзяленне ГА «БАЭіГП».

Наступны семінар быў праведзены у Віцебску–Оршы–Полацку 19–22 верасня 2000 года. Тэма семінара: «Экскурсія – неад’емная частка турысцкага падарожжа». Ініцыятарамі семінара былі ГА «БАЭіГП», Віцебскае і Полацкае аддзяденні ГА «БАЭіГП». На семінары прысутнічала 45 чалавек.

У рабоце семінара прынялі удзел кандыдат гістарычных навук, старэйшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, член Саюза пісьменнікаў С.В.Тарасаў, прэзідэнт ГА «БАЭіГП» Чыркі М.А., кансультант упраўлення турызму міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, віцэ–прэзідэнты ГА «БАЭіГП» Сісмеева Я.А., Каліноўскі І.І., практыкі экскурсійнай справы, метадысты, экскурсаводы, гіды–перакладчыкі, кіраўнікі турысцкіх арганізацый, выкладчыкі ВНУ краіны.

Выступленне з асноўным дакладам прэзідэнта ГА «БАЭіГП» Чырскага М.А., кансультанта упраўлення турызму міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь «Экскурсія – неад`емная частка турыскага маршрута» вызначыла стратэгію і ход абмеркавання цэлага комплекса важнейшых праблем экскурсійнай работы. На чатырох пленарных пасяджэннях і сустрэчах за «круглым сталом»разглядаліся наступныя тэмы:

Экскурсія – неад’емная частка турыскага маршрута.

Падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кадраў для экскурсійнай справы.

Экскурсія – педагагічны працэс.

З вопыта работы па арганізацыі экскусій і тураў па Беларусі.

На семінары абмяркоўваліся праблемы экскурсійнай работы. Да найбольш актуальных праблем, якія разглядаліся ў Віцебску і Полацку адносяцца:

–распрацоўка нарматыўна–прававой базы экскурсійнага турызму;

–стварэнне кіруючых структур па экскурсійнай рабоце і вучэбна–метадычных цэнтраў.

ПолесГУ

У цэлым праведзены семінар з`явіўся важным мерапрыемствам, у працэсе якога зроблена ацэнка сучаснага стана экскурсійнага турызму і намечаны шляхі далейшага развіцця экскурсійнай справы у Беларусі.

Улічваючы, што экскурсія – адзіны асабісты прадукт, які ствараецца турыстычным прадпрыемствам, удзельнікі семінара прынялі рашэнне рэкамендаваць МСіТ стварыць:

Галоўнае экскурсійнае упраўленне.

Беларускі экскурсійна–метадычны цэнтр з яго рэгіянальнымі аддзяленнямі ў Брэсце, Гродна, Віцебску, Магілёве, Гомелі, Мінску.

Улічваючы, што экскурсійная работа патрабуе вялікіх затрат у падрыхтоўцы і распрацоўцы экскурсій высокакваліфікаванымі спецыялістамі, прапанавалася вызваліць турысцкія арганізацыі ад выплаты падаткаў пры арганізацыі экскурсійнага абслугоўвання, што было зроблена, а пазней распаўсюджана не толькі на экскурсіі, а таксама на іншыя віды турпрадукта.

Знізіць арэндную плату для тураператарскіх арганізацый і экскурсійных бюро, якія займаюцца экскурсійна–метадычнай работай. На семінары была прынята рэзалюцыя па далейшаму развіццю экскурсійнай справы.

Старшыні грамадскага аб`яднання Віцебска Рудая Л.Ф. і Полацка Каліноўскі І.І. паказалі экскурсійныя магчымасці Віцебскага рэгіёна. Удзельнікі семінара пабывалі на аглядных экскурсіях па гораду Віцебску і Оршы, наведалі Купалаўскі запаведнік «Ляўкі», мемарыяльную сядзібу імя Іллі Рэпіна «Здраўнёва», раённы цэнтр Гарадок, а затым падрабязна пазнаёміліся з гісторыка–культурнай спадчынай старажытнага Полацка, які з павагай называюць бацькам беларускіх гарадоў і месцам, адкуль пачалася беларуская дзяржава.

У 2000 годзе у Сусветны дзень турызму 27 верасня ў Доме – музеі І з`езда РСДРП у Мінску была адкрыта экспазіцыя–выстава «З веку ў век» (З гісторыі развіцця турызму ў Беларусі). Выстава працавала тры месяцы і выклікала шырокую цікавасць грамадскасці. Вось што пісала газета «Культура» № 9 3–9 сакавіка 2001 года ў артыкуле «З веку ў век» «Пад такой назвай у сталічным музеі І з`езда РСДРП працуе турыстычная выстава, на якой адлюстраваны этапы развіцця турызму на Беларусі. Падчас знаёмства з экспазіцыяй маімі суразмоўцамі былі кансультант упраўлення турызму Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, прэзідэнт грамадскага аб`яднання «Беларуская асацыяцыя экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў» Мікалай Чырскі і старшыня Мінскага аддзялення вышэйназванай арганізацыі Людміла Тарасава.

Выставу сумеснымі намаганнямі арганізавалі грамадскія аб`яднанні «Беларуская федэрацыя турызму» і «Беларуская асацыяцыя экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў». Паводле слоў Людмілы Тарасавай, за першыя тры месяцы працы выставу наведалі паўтары тысячы чалавек. Гэта сведчыць пра вялікую зацікаўленасць мінчан развіццём айчыннага турызму.

На выставе «З веку ў век» можна ўбачыць самыя разнастайныя матэрыялы, прысвечаныя працы турыстычных арганізацый мінулага. У першую чаргу рэспубліканскага турысцка–экскурсійнага аб`яднання «Беларустурыст» Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. У савецкі час гэтае аб`яднанне адчыніла 33 экскурсійныя бюро, пабудавала 9 гасцініц і 9 турыстычных баз.

Беларусь фрахтавала дзеля турыстычных мэт цеплаходы, якія рабілі круізы па Волзе і іншых вялікіх рэках СССР. Нашы суайчыннікі любілі вандраваць на параходзе «Мінск, цеплаходах «Аляксандр Пірагоў» і «Васіль Сурыкаў». Вельмі папулярным у савеці час быў чыгуначны транспарт. Што год тысяча нашых суайчыннікаў падарожнічалі па чыгуначных маршрутах, якія злучалі паміж сабой сталіцы савецкіх рэспублік, гарады–героі і іншыя цікавыя турыстычныя цэнтры. Дзяржава моцна клапацілася пра развіццё экскурсійнага турызму. Рабілася гэта з мэтай як мага глыбей пазнаёміць насельніцтва са сваім краем. Усё гэта знайшло свё адлюстраванне на выставе, дзе былі прадстаўлены метадычныя распрацоўкі экскурсій, карткі экскурсаводаў, маршруты, распрацаваныя супрацоўнікамі Мінскага бюро падарожжаў і экскурсій у 70–80–ыя гады. У тыя часы Беларусь карысталася вялікай папулярнасцю сярод аматараў вандровак, асабліва тых, якія былі звязаны з тэмай Вялікай Айчыннай вайны, імелі важнае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне. Сярод маршрутаў на гэтую тэму была прадстаўлена экскурсія на мемарыяльны комплекс Хатынь, пра які ведалі не толькі нашы грамадзяне, але і людзі ва ўсім свеце. У 60–80–ыя гады не пакідалі па–за ўвагай і дзяцей, для якіх рабілася многа экскурсій. Іх тэматыка самая разнастайная: ваенна–гістарычная, ваенна–рэвалюцыйная, гісторыка–архітэктурная, прыродазнаўчая, літаратурная… Выстава паказала, што маршруты, якія ствараліся у 1970–80–я гадыпрацягваюць карыстацца папулярнасцю і ў XXI стагоддзі.

На выставе прадстаўлены кампакт–дыск з запісамі найбольш папулярных маршрутаў па Беларусі. Ён запісаны супрацоўнікамі мінскага аддзялення «Беларуская асацыяцыя экскурсаводаў і

ПолесГУ

гідаў–перакладчыкаў». Адлюстравана на выставе і дзейнасць установ, якія ўваходзілі ў сістэму Дзяржаўнага камітэту «Інтурыст» СССР. Яго аддзяленне мелі добрае супрацоўніцтва з турысцкімі агентствамі многіх краін свету і прадстаўлялі нашу Рэспубліку замежным гасцям.

У экспазіцыі можна ўбачыць узнагароды лепшых прадстаўнікоў беларускага турызму. Так, у свой час загадчыку аддзела падарожжаў і экскурсій у Беларускім рэспубліканскім савеце па турызму і экскурсіях Інесе Ігнацьевай уручылі грамату Вярхоўнага Савета БССР, а яшчэ яе ўзнагародзілі значком «За заслугі у развіцці турызму і экскурсій». Яна, здаецца, адзіная прадстаўніца турыстычнай сферы Беларусі, хто атрымаў медаль «За працоўную адзнаку». Не забыліся арганізатары выставы і пра развіццё спартыўнага турызму рэспублікі. Тут можна пазнаёміцца са справаздачамі шматлікіх турыстычных груп, якія ў 60–70–ыя гады здзейснілі мноства вандровак у межах краіны. Можна ўбачыць намёты, кацялкі, іншыя рэчы, якімі нашы турысты некалі карысталіся. Ёсць матэрыялы пра міжнародную комплексную антарктычную экспедыцыю «Насустрач XXI стагоддзю». Прадстаўлена адмысловая чаша, у якой буў запалены агонь у Антарктыдзе ў межах міжнароднай акцыі «Марш міру. Шлях у трэцяе тысячагоддзе». Ёсць экспанаты, звязаныя з дзейнасцю вядомага тэлежурналіста Аляксандра Чуланава, які вёў на беларускім тэлебачанні праграму «Вецер вандраванняў». Некалі ён абышоў ледзь не кожны куток Беларусі…

А яшчэ на выставе было мноства іншых самых разнастайных экспанатаў, якія расказваюць пра турыстычныя выставы, кірмашы. Таксама была прадстаўлена рэспубліканская турыстычная прэса.

Трэба зазначыць, што дзейнасць Грамадскага аб`яднання «Беларуская асацыяцыя экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў» аказала значны ўплыў на далейшае развіццё экскурсійнай справы ў Беларусі, хаця не ўсе прапановы і ініцыятывы з яго боку былі своечасова ацэнены і ўвасоблены на практыцы.

З 2007 года уведзена дзяржаўная атэстацыя экскурсаводаў. ГА «БАЭіГП» прымае актыўны удзел у падрыхтоўцы экскурсаводаў да атэстацыі і ў яе непасрэдным правядзенні. Для гэтага грамадскім аб`яднаннем было арганізавана павышэнне кваліфікацыі у Брэсцкім дзяржаўным універсітэтам імя А. Пушкіна, Магілёўскім дзяржаўным універсітэтам імя А. Куляшова, Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя П. Машэрава, Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны і Беларускім дзяржаўным універсітэце. У Пінску, Полацку, Гродна і іншых гарадах праводзіліся семінары, а таксама практычныя і тэарэтычныя заняткі, якія дапамаглі экскурсаводам паспяхова прайсці атэстацыю. Члены Праўлення уваходзяць у склад Дзяржаўнай атэстацыйнай камісіі па атэстацыі экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў і прымаюць удзел у яе пасяджэннях. Старшыні рэгіянальных аддзяленняў ГА «БАЭіГП» пастаянна вядуць на грамадскіх пачатках вялікую работу па падрыхтоўцы экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў да тэсціравання і атэстацыі, іх забеспячэнню неабходнымі матэрыяламі, а таксама займаюцца арганізацыйныя пытанні, звязанымі з прыездам спашукальнікаў у Мінск.

З 2009 года разам з ГА «Беларускі фонд культуры» і ГА «Беларускі камітэт ІКАМОС» ГА «БАЭіГП» штогод ладзіць «Фэст экскурсаводаў», прымеркаваны да Міжнароднага дня помнікаў і памятных мясцін, які адзначаецца ва ўсім свеце 18 красавіка па ініцыятыве ЮНЭСКА. Ініцыятары гэтага фэста – маладыя сталічныя экскурсаводы Павел Каралёў і Цімох Акудовіч. Фэст узнік з мэтай пазнаёміць жыхароў канкрэтных рэгёнаў, гарадоў, вёсак, раёнаў і нават вуліц з цікавымі мясцінамі Беларусі. Многія экскурсіі з’яўляюцца эксклюзіўнымі і арганізуюцца толькі у рамках «Фэсту экскурсаводаў». Трэба адзначыць, што у фэсце прымаюць удзел не толькі маладыя, але і сталыя экскурсаводы і гіды–перакладчыкі, краязнаўцы і вучоныя, музейныя супрацоўнікі, выкладчыкі ВНУ, журналісты, артысты тэатраў. Гэта Свята аб`яднала неабыякавых да сваёй гісторыі і культуры людзей і з кожным годам набывае ўсё большую папулярнасць.. А як вядома, турызм і культура аб’ядноўваюць людзей, спрыяюць лепшаму паразуменню між народамі і садзейнічаюць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці.

У 2000–ыя гады было зроблена шмат па расшырэнню і прапагандзе экскурсійнай тэматыкі. У выніку з’явіліся новыя цікавыя маршруты экалагічнага накірунку, якія распрацоўваў вядомы краязнаўца і эколаг А.М. Дуброўскі. Гэтая важная праца была адзначана дыпломам Рэспублікаскага конкурса «Пазнай Беларусь». Пачала распрацоўвацца яўрэйская тэма, прысвечаная жыццю яўрэйскіх «штэттлаў», знакамітым асобам яўрэйскай гісторыі,я кія цесна звязаны з Беларуссю (Марк Шагал, Хаім Суцін, Хаім Вейцман, Менахім Бегін і інш.) і трагедыі Халакоста. Галоўная ўзнагарода першага Рэспубліканскага конкурса «Пазнай Беларусь» была прысуджана менавіта за распрацоўку экскурсіі «Пінскія яўрэі ў міравой гісторыі», якую ажыццявіла Т.А. Хвагіна.

У 2002 годзе у канцэртнай зале Пінска прайшла прэзентацыя кнігі Т.А. Хвагінай «Чароўная казка Палесся», якая палажыла пачатак стварэнню значнай колькасці цікавых навукова–



ПолесГУ

папулярных выданняў, альбомаў у даведнікаў, прысвечаных розным турыстычным рэгіёнам краіны. Гэта мела вялікае значэнне з пункту гледжання рэкламы экскурсій і падарожаў, помнікаў гісторыі і культуры і папулярызацыі прафесіі экскурсавода.

Сістэматычна праводзіліся вучэбныя экскурсіі. Да юбілеяў Ігната Дамейкі і Якуба Коласа экскурсаводы наведалі Мядзведку, Мір, Стоўбцы і Коласаўскі запаведнік. Фундатарам дадзенага мерапрыемства выступіла турысцкае прадпрыемства «Ружа вятроў» з Пінска. Перыядычна бясплатныя экскурсіі, дзякуючы падтрымцы турыстычных фірм, праводзіліся для настаўнікаў школ. Напрыклад: экскурсія «Якуб Колас на Піншчыне», «Дарогамі памяці», «Тайны парка Дубае», «На радзіму Напалеона Орды» і інш.

У 2005 годзе Брэсцкае абласное упраўленне па фізічнай культуры, спорту і турызму сумесна з Пінскім аддзяленнем аб`яднання экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў правялі семінар, прысвечаны турысцкім рэсурсам Палесся. У рамках семінара была праведзена прэзентацыя кнігі Хвагінай Т.А. «Палессе ад Буга да Убарці» і праведзена вучэбная экскурсія па маршруту Пінск–Тураў. У гэтым жа годзе экскурсаводы Пінска распрацавалі тэматыку экскурсій, заснаваную на супольнай гісторыка–культурнай спадчыне Беларусі і Польшчы.

У 2012 годзе БАЭіГП была перарэгістравана у Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь і атрымала назву беларускае Грамадскае абяднанне экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў (скарочана БГАЭі ГП).

Старшынёй БГАЭіГП быў выбраны Чырскі М.А., намеснікамі старшыні былі выбраны – Федарцова Т.А., Хвагіна Т.А., Карагодава Л.А. Старшынёй Рэвізійнай камісіі быў выбраны Мельніцкі Я.Л. У рэгіяналных аддзяленнях гамадскага аб`яднання у найбольш «экскурсійных» гарадах Беларусі прайшлі сходы экскурсаводаў і былі выбраны старшыні: у Мінску Кантаровіч А.Н., у Брэсце Сісмеева Я.А., у Пінску Хвагіна Т.А., у Віцебску Цярэшка І.В., у Гродна Словік С.У., у Магілёве Супіталёва Л.І.

У гэтым жа 2012 годзе 24–25 верасня ў Мінску адбыўся першы з`езд экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў Беларусі. Ініцыятыва правядзення з`езда належыць Беларускаму грамадскаму аб`яднанню экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў. У з`ездзе прынялі удзел 170 дэлегатаў, у тым ліку дырэктар Дэпартамента па турызму Міністэрства спорта і турызма Рэспублікі Беларусь В.П. Кармазін, кансультант аддзела планавання і арганізацыі турысцкай дзейнасці М.В. Масташова, экскурсаводы, гіды–перакладчыкі, прадстаўнікі навуковых, музейных установ і СМІ. З`езд прыняў наступную рэзалюцыю.

Рэзалюцыя

Першага з`езда экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў Беларусі

Тэма: «Стан і перспектывы развіцця экскурсійнай справы ў Беларусі»

24–25 верасня 2012 г. у горадзе Мінску прайшоў Першы зезд экскурсоводаў і гідаў–перакладчыкаў Беларусі, арганізатарам, якога при падтрымцы Дэпартамента по турызму МСіТ, абласных управленняў фізічнай культуры, спорту і турызму, геаграфічнага факультэта БДУ, газеты «Туризм и Отдых», ГДА «Холидэйбай» выступіла Беларускае грамадскае аб`яднанне экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў.

Мэта з`езда аналіз стану экскурсійнага турызму у Беларусі, пошукі шляхоў выхаду з крызіса, абмеркаванне актуальных праблем правемійнай дзейнасці экскурсоводаў і гідаў–перакладчыкаў і выпрацоўка рэкамендацый па развіццю і падтрымцы экскурсійнай справы.

У рабоце з`езда прыняло удзел звыш 170 дэлегатаў з турысцкіх цэнтраў і рэгёнаў Беларусі: вядучыя спецыялісты Дэпартамента па турызму МсіТ, Нацыянальнага агентства па турызму, экскурсоводы, гіды–перакладчыкі, прадстаўнікі турбізнеса, краязнаўцы, вучоныя, выкладчыкі ВНУ, прадстаўнікі СМІ.

На з`ездзе абмяркоўваліся актуальныя праблемы экскурсійнага турызму Беларусі і прафесійнай дзейнасці спецыялістаў дадзенай сферы. У прамове старшыні БГАЭіГП Чырскага М.А., выступленнях дэлегатаў і гасцей з`езда былі разгледзены наступныя пытанні:

Стан і перспектыв развіцця экскурсійнага турызму у Беларусі;

Канцэптуальны падход да экскурсійнай справы;

Тэорыя і метадалогія экскурсійнай справы, яе удасканаленне, навукова–метадычнае забеспячэнне экскурсійнай работы;

Арганізацыя экскурсійнай работы у турысцкіх установах Беларусі;

Выкарыстанне турысцкіх рэсурсаў Беларусі у мэтах развіцця экскурсійна пазнавальнага турызму у Беларусі;

Дзяржаўнае рэгуляванне экскурсійнай работы, кантроль за якасцю праводзімых экскурсій;

ПолесГУ

Традыцыі і інавацыі у экскурсійнай рабоце;

Падрыхтоўка, павышэнне кваліфікацыіі атэстацыя экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў.

Работа з`езда была накіравана на усебаковае даследванне праблем экскусійна–пазнавальнага турызму, шырокі абмен думак і выпрацоўку прапаноў і рэкамендацый па выхаду з крызісу.

Асаблівая увага на з`ездзе была звернута на неабходнасць дзяржаўнай падтрымкі экскусійна–пазнавальнага (унутранага і уязнога) турызму, важнасць яго папулярызацыі, з улікам станоўчага замежнага вопыту.

З`езд канстатаваў, што экскурсійная справа у Беларусі, ня гледзячы на турысцкі патанцыял і традыцыі беларускай экскурсійнай школы, пераживе глыбокі крызіс і прызваў звярнуць увагу на важнсць экскурсійнай справы для дзяржавы, грамадства і беларускага турбізнесу.

У мэтах развіцця пазнавальнага турызму і экскурсійнай справы у Беларусі з`езд рэкамендуе:

1. Распрацаваць пры удзеле прафесіяналаў экскурсійнай справы, прадстаўнікоў турбізнесу, эканамістаў, навуковага кола канцэпцыю развіцця унутранага і уязнога турызму ў Беларусі;
2. Распрацаваць механізмы узаемадзеяння, каапераціі і стымулявання турбізнесу, змежных міністэрстваў і ведамстваў, для эфектыўнага выкарыстання турысцкіх рэсурсаў Беларусі і рэалізацыі праграмы развіцця пазнавальнага турызму;
3. Для забеспячэння высокай якасці экскурсій, развіцця экскурсійнай справы, аказання практычнай дапамогі экскурсаводам, гідам–перакладчыкам і сецыялістам турысцкіх прадпрыкмстваў прыступіць да паэтапнага стварэння Беларускага экскурсійна–метадычнага цэнтра у Мінску, абласных рэгіянальных турысцкіх цэнтраў;
4. Удасканаліць сістэму адукацыі і павышэння кваліфікацыі у сферы турызму с мэтаю павышэння яе эфектыўнасці і практыкаарыентаванасці;
5. Перанесці атэстацыю экскурсаводаў, гідаў–перакладчыкаў на рэгіянальны узровень;
6. Распрацаваць механізмы кантроля за якасцю экскурсій;
7. Распрацаваць Кодэкс экскурсавода і гіда–перакдадчыка Рэспублікі Беларусь;
8. Замацаваць вопыт і лепшыя дасягненні беларускай экскурсійнай школы у навукова–метадычнай літаратуры.

Рашэнне з`езда было адрасавана: Міністэрству спорту і туризму Рэспублікі Беларусь, Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрству інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Беларускаму грамадскаму аб`яднанню экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў.

Нарэшце, у 2000–я гады менавіта БГАЭіГП звярнула увагу турысцкай грамадскасці Беларусі на свята «Сусветны дзень гіда і экскурсавода». Штогод 21 лютага гіды і экскурсаводы усяго свету адзначаюць сваё прафесійнае свята – Міжнародны дзень гіда (World Federation of Tourist Guide Associations – WFTGA). Гэтае свята адзначаецца штогод па ініцыятыве Міжнароднай федэрацыі асацыяцый турысцкіх гідаў і экскурсаводаў. Упершыню сваё прафесійнае свята гіды і экскурсаводы адзначылі у 1990 годзе у Лондане. Мэтаю свята – звярнуць увагу да прафесіі і умацавання міжнародных сувязей, якія дапамагаюць больш плённа развіваць турызм і яго культуру. У рамках Сусветнага дня гіда і экскурсавода у многіх краінах праходзяць прафесійныя семінары, тэматычныя конкурсы, цікавыя прэзентацыі і трэнінгі для тых, хто хоча самаудасканальвацца у актуальнай і важнай прафесіі. Адна з галоўных задач свята – засяродзіць увагу шырокага кола грамадскасці да якасці і цэннасці работы прафесійных гідаў і экскурсаводаў, зацвярджэнню іх сапраўднай ідэнтычнасці, важнасці арганізацыі прафесійнай адукацыі, умацавання міжнародных сувязей, фарміраванню сусветнага супольніцтва і экскурсійнага брацтва. Прафесія гіда і экскурсавода з`яўляецца інтэрнацыянальнай, паважанай, прэсціжнай, і многапланавай. Гэта звязана з прывабнасцю, арыгінальнасцю дадзенага віда працоўнай дзейнасці, яе унікальнасцю, інтэлектуальным характарам. Беларускае грамадскае аб`яднанне экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў намерана садзейнічаць стварэнню, развіццю і пашырэнню грамадства прафесіяналаў музейнай справы, турысцкіх гідаў і экскурсаводаў, якія прадстаўляюць унікальную магчымасць для зносін, абмена вопытам, ведамі, генерацыі інавацыйных ідэй сярод спецыялістаў.

17–22 лістапада 2015 года у Маскве прайшоў 17–ы кангрэс Еўрапейскай федэрацыі асацыяцый турысцкіх гідаў (FEG). Кангрэс прайшоў пад дэвізам «Мастацтва быць гідам». Магчыма, па–гэтаму у выступленнях так часта гаварылі аб важнасці адказнага падыхода да прафесіі гіда і экскурсавода. Менавіта гід і экскурсавод стварае ураджанне аб краіне і можа як прыцягнуць, так і адвярнуць турыстаў ад дыстынацыі. З Беларусі у кангрэсе прынялі удзел старшыня БГАЭіГП Чырскі М.А. і намеснік старшыні БГАЭіГП Карагодава Л.А., якая ў рамах грамадскага аб’яджнання адказвае за накірунак, звязаны з падрыхтоўкай і работай гідаў–перакладчыкаў.



ПолесГУ

22 верасня 2016 года у Мінску пройдзе навукова–практычная канферэнцыя, прысвечаная 20–годдзю Беларускага грамадскага аб'яднання экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў. Тэма канферэнцыі: «Экскурсійна–пазнавальны турызм як важны фактар прапаганды і развіцця нацыянальнай культуры» У рабоце канферэнцыі прымуць удзел экскурсаводы, гіды–перакладчыкі, выкладчыкі ВНУ, метадысты і практыкі экскурсійнай справы, кіраўнікі турысцкіх арганізацый, краязнаўцы, прадстаўнікі СМІ, органы дзяржаўнага кіравання.

У юбілейны для грамадскага аб'яднання год актыўная праца на карысць культурна–пазнавальнаму турызму працягваецца.

Экскурсаводы і гіды–перакладчыкі Мінскага аддзялення БГАЭіГП сабралі 500000 тысяч рублёў на добраупарадкаванне магілы народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна ва Ушачах. Неаднаразова былі ініцыятарамі і актыўнымі ўдзельнікамі добраўпарадкавання Парка–музея валуноў ва Уручча. БГАЭіГП звяртае увагу на добраупарадкаванне тэрыторыі вакол помнікаў архітэктуры, а таксама іх захавання і наданне ім адпаведнага статусу. Так быў уратаваны ад забудовы участак старога Пінска – земляны вал на скрыжаванні вуліц Горкага і Чырвонафлоцкай. Намаганнямі аб'яднання спынілі знос будынку былога пінскага старосства, які ўзводзіўся ў стылістычным адзінстве з палацам Бутрымовіча і зараз выкарыстоўваецца як аб'ект турысцкай інфрастуктуры – рэстаран «Франт». Па ініцыятыве экскурсаводаў пастаўлены помнікі, памятныя знакі і мемарыяльныя дошкі на пінскім дзяцінцу, на месцы злучэння Піны і Прыпяці, на сёмым кіламетры шашы Ганцэвічы–Лагішын, дзе загінулі ахвяры Халакосту і г.д. Зараз па ініцыятыве грамадскага аб'яднання былі пададзены дакументы ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь для ўключэння ў спіс прамысловых помнікаў «Шухаўскай вежы» ў Барысаве.

Беларускім грамадскім аб`яднаннем экскурсаводаў і гідаў–перакладчыкаў па меры неабходнасці (звычайна – раз на месяц) праводзяцца заняткі з гідамі і экскурсаводам, накіраванаыяі па павышэнне іх прафесійнага майстэрства. Гэта лекцыі па гісторыі і культуры Беларусі, сустрэчы з пісьменнікамі, этнографамі, вядомымі людзьмі, вучонымі у розных галінах навукі, наведванні майстэрняў мастакоў і скульптараў.

Вялікае значэнне для экскурсаводаў маюць практычныя заняткі ў выглядзе вучэбных экскурсій і аб'ездаў. За апошнія пяць гадоў іх было праведзена больш за 40, у сярэднім 8–10 за год. Але на самой справе яшчэ больш, таму што па меры неабходнасці рэгіянальныя аддзяленні робяць шмат незапланаваных мерапрыемстваў. Добрай традыцыяй стаў удзел грамадскага аб'яднання і яго рэгіянальных структур у розных святах і фестывалях, такіх як Дзень пісьменства і друку, Дажынкі, фестываль «Мотальскія прысмакі»,фестіваль «Музы Несвіжа», рыцарскія фесцівалі ў беларускіх замках і г.д.

Усё гэта дапамагае экскурсаводам і гідам–перакладчыкам пашыраць свой кругазор, асвойваць новыя экскурсійныя тэмы і рабіцца прафесіяналамі высокага ўзроўню. Не застаецца па–за межамі дзейнасці грамадскага аб'яднання метадычная і навкова–даследчая праца. Турыстычная грамадскасць, а таксама выкладчыкі навучальных установ добры знаёмы не толькі з навукова–папулярнымі выданнямі, але і падручнікамі і навучальнымі дапаможнікамі , якія створаны з удзеламі членаў грамадскага аб'яднання, перш за ўсё Т.А. Федарцовай, М.А. Чырскім, Т.А. Хвагінай. Гэты накірунак мае значэнне з пункте гледжання практычнай адаптацыі да сучасных рэалій тэарэтычных асноў экскурсійнай справы, якія былі закладзены савецкімі спецыялістамі ў дадзенай галіне і зараз патрабуюць адказнага і крытычнага перагляду.

Апошнім часам узмацніліся міжнародныя кантакты грамадскага аб'яднання з грамадкімі аб'яднаннямі экскурсійнага накірунку з Расіі, Польшчы і Украіны. Перыядычна праходзяць сустрэчы з іх прадстаўнікамі. У Пінску некалькі разоў прымалі дэлегацыі Польскага турыстычна–краязнаўчага таварыства (аддзелы «Мазовія», «Сандамір» і др.). У 2013 годзе дэлегацыя грамадскага аб'яднання прымала ўдзел у юбілейным паседжанні ПТТК (аддзел «Мазовія), якое адбылося ў Нацыянальным парку «Кампіноская пушча» пад Варшавай. У 2016 годзе падпісана ўмова аб супрацоўніцтве ў экскурсійнай і краязнаўчай галіне з Сувальская турыстычнай арганізацыяй. Разам з польскімі калегамі ў рамках праекта «Агуьная спадчына» ідзе распрацоўка новых трансгранічных маршрутаў рознай тэматыкі, якая завяршыцца іх прэзентацыяй і абменам турыстычнымі групамі з экскурсаводаў, гідаў–перакладчыкаў і краязнаўцаў.

Зараз, калі ідзе падрыхтоўка да правядзення навукова–практычнай канферэнцыі, прысвечанай 20–годдзю дзейнасці грамадскага аб'яднання, ёсць магчымасць цвяроза зірнуць не толькі адзначаныя вышэй дасягненні, але і на невырашаныя праблемы, якія найчасцей звязаны з адсутнасцю сродкаў, дзейснай падтрымкі з боку турбізнэса, адсутнасці разумення важнасці экскурсійнай справы ў маштабах дзяржавы і яе грамадства.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Олюнина, И.В.Современная практика экскурсионной работы в Республике Беларусь : пособие / И.В. Олюнина, Н.В. Суслова. – Минск: БГУ, 2014. – 142 с.

2. Хвагина, Т.А. Брестчина от Беловежской пущи до полесских болот. Электронная версия путеводителя / Т.А. Хвагина, А.Г. Варавва. – Минск : Рифтур, 2013 г. – 256 с.

## TWENTY YEARS OF ACTIVITY OF THE BELARUSIAN PUBLIC ASSOCIATION OF GUIDES AND GUIDE–INTERPRETERS

***N.A. CHIRSKII***

***Summary***

The article reflected the history of the activities of the Belarusian public association of guides and guide–interpreters, the stages of development of the organization, as well as the main points of its operation. The book is about the excursion towards the Pinsk city department BPAGiGI, as well as the idea of creating and publishing reference books and popular scientific publications on the famous places of Belarus to promote the tourism opportunities of the country. Reflected activities holding seminars aimed at promoting the tour business. It is told about the first congress of the guides and guide–interpreters, as well as its acceptance of the resolution.

*Статья поступила 4 апреля 2016г.*

ПолесГУ